народныя песні, дзеці аўтаматычна вучацца гуманнасці, дабрыні, памяркоўнасці, мяккасардэчнасці, добразычлівасці, шчырасці.

Спевы народных песень на роднай мове, вывучэнне традыцыйнай культуры свайго народа дапамагаюць фарміраваць любоў да свайго краю, мовы, гісторыі. Л.Л. Ражкова лічыць, што дзейнасць аматарскіх мастацкіх калектываў дазваляе комплексна выкарыстоўваць тры галоўныя складаючыя фарміравання **нацыянальнай самасвядомасці**:

1. набыццё і ўзбагачэнне нацыянальных ведаў;
2. узмацненне нацыянальных пачуццяў;
3. уключэнне асобы ў нацыянальныя па змесце віды дзейнасці [7, с. 3].

Заняткі ў фальклорных калектывах аказваюць станоўчы ўплыў на **фізічнае развіццё** дзяцей. Народныя гульні на вольным паветры разнявольваюць і знімаюць нервовае напружанне, спевы народных песень спрыяюць умацаванню глыбокага спеўнага дыхання.

Напрыканцы варта зрабіць наступныя высновы адносна эстэтыка-выхаваўчага ўплыву народнай песні на асобу дзіцяці ў фальклорным гурце.

1. Этнакультурнае выхаванне ў дзіцячым фальклорным гурце павінна быць пабудавана з улікам педагагічных функцый народнай творчасці (сацыялізацыя і інкультурацыя, эстэтычнае і экалагічнае выхаванне, маральнае і фізічнае развіццё, патрыятычнае выхаванне).
2. Вывучэнне народных твораў (песень) у фальклорных калектывах дапамагаюць фарміраваць любоў да свайго краю, мовы, гісторыі, далучаць дзяцей да культуры грамадства, фарміруюць яго эстэтычныя погляды, аказваюць уплыў на экалагічнае, маральнае, фізічнае, патрыятычнае развіццё дзяцей.

Спіс літаратуры:


1. Аляхновіч, А.М. Народная песня ў школе : дапам. для настаўнікаў музыкі і спеваў, кл. кіраўнікоў, выхавальнікаў / А.М. Аляхновіч. – Мн.: Беларусь, 2004. – 171с.
2. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка. / Г.П. Арлова. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 120 с.
3. Барташэвіч, Г.А. Сістэма жанраў беларускага дзіцячага фальклору / Г.А.Барташэвіч // Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / пад рэд. А.С. Фядосік. – Мн.: Бел. навука, 2004. – С.369 – 381.
4. Болбас, В.С. Этычная педагогіка беларусаў / В.С.Болбас. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 175 с.
5. Грыгаровіч, Я.Д. Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект / Я.Д. Грыгаровіч – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2002. – 403 с.
6. Кухаронак, Т.І. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў : вучэб.-метад. дапам. / Т.І. Кухаронак, В.Г.Кухаронак. – Мн.: БДПУ, 2005. – 108с.
7. Ражкова, Л.Л., Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах : аўтарэферат дыс. ... канд. пед. навук : 13.00.05 / Л.Л. Ражкова. – Мн., 2007. – 21 с.



***Сяргей Ярук***


# БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ДУХАВЫЯ МУЗЫЧНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ Ў СУЧАСНАЙ ВЫКАНАЛЬНІЦКАЙ ПРАКТЫЦЫ

Сярод народных музычных інструментаў найбольш старажытнымі з'яўляюцца духавыя: *свісткавыя* (дудкі розных строяў, парныя дудкі, поршневая дудка, акарына), *язычковыя* (жалейка, дуда, чаротка, саломка), *амбушурныя* (труба, рог). Яны да нядаўняга часу бытавалі сярод пастухоў, паляўнічых, музыкантаў-аматараў, але па прычыне змянення сацыяльных і вытворча-эканамічных умоў жыцця амаль зніклі. Вельмі плённа ў 70-80 гг. XX ст. з беларускімі народнымі духавымі інструментамі працавалі І. Лычкоўскі, У. Крайко, В. Пратасевіч, У. Пратасевіч, У. Пузыня. Зараз вядомы імёны наступных майстроў: В. Кульпін, А. Лось (мал. 1), Д. Гром, П. Саламенюк, А. Жукоўскі, А. Еўдакімаў, Ю. Скрамблевіч і іншыя [5, с. 3]. Але праблему буйнога тыражавання народнага інструментарыя намаганнямі гэтай групы энтузіястаў немагчыма вырашыць без стабільнай падтрымкі, у тым ліку – з боку дзяржавы. У той жа час беларускімі народнымі майстрамі ўжо сёння распрацаваны цэлыя сямейства дудак, жалеек, акарын, дуд, драўляных труб, маючых розны строй. У выніку стала магчымым выкарыстоўваць гэтыя інструменты амаль ва ўсіх танальнасцях і ў шырокім дыяпазоне [5, с. 4].

Дудка, дуда, жалейка – не зусім звыклыя інструменты сёння, але раней без іх удзелу не абыходзіліся народныя святы і абрады. Аднак, не ва ўсіх святах мог прымаць удзел выканаўца на той жа дудцы, які некалі наогул не лічыўся за музыку таму, што на гэтым інструменце пераважна ігралі пастухі (у народзе казалі: «Дзе пастухі, там і дудкі».). У лік музыкаў (калі не трэба было пасвіць хатнюю жывёлу) яны станавіліся падчас такіх свят, як Каляды, Вялікдзень, Радуніца, Купалле.

Напрыканцы XX ст. з'явілася вялікая цікавасць да каранёвых інструментаў. У 2000 г. у Беларускім дзяржауным універсітэце культуры на кафедры духавых і ўдарных інструментаў адкрываецца аддзяленне духавых народных інструментаў, дзе рыхтуюць выканаўцаў на іх. Пры універсітэце пачала працаваць лабараторыя па вырабе музычных інструментаў [8, с. 4]. Намаганнямі У. Грома, А. Крамко, І. Мангушава ў 2005 г. была выдадзены вучэбна-метадычны дапаможнік «Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах» у дзвюх частках (для сольнага і ансамблевага выканання). Гэта першае спецыялізаванае выданне, якое ліквідуе недахоп нотнага матэрыялу для беларускіх народных духавых і папулярызуе нацыянальны духавы інструментарый [7, с. 119–122].



*Малюнак 1* – Народныя майстры Віктар Кульпін і Алесь Лось праводзяць заняткі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы ва УА БДУКМ (2006 г.)

У сучаснай народна-інструментальнай практыцы беларускія народныя духавыя музычныя інструменты сустракаюцца амаль ва ўсіх калектывах, як прафесійных, так і аматарскіх. Вядучым прафесійным калектывам, у якім адным з першых пачалі выкарыстоўваць беларускія народныя духавыя інструменты, з'яўляецца Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара М. Казінца. На базе гэтага калектыва існуюць ансамблі дудак, дуд, жалеек, акарын, ансамбль салістаў пад кіраўніцтвам заслужанага артыста краіны А. Крамко. Салістамі аркестра з'яўляюцца выпускнікі БДУКМ: заслужаны артыст Беларусі А. Крамко і лаўрэат міжнароднага конкурса А. Рыцікаў. У рэпертуары калектыва шэраг канцэртных твораў, напісаных ці апрацаванных для беларускіх народных духавых інструментаў: «Абцасы з выкрунтасам», «У агародзе верабей», «Ох, без дудкі, без дуды ходзяць ногі не туды», «Полька», «Кругавыя танцы» А. Крамко; «Дудары» з «Палескай сюіты», «Святочная паэма» Я. Глебава; «Палессе», «Жалейка» В. Кузняцова; «Палескія танцы» І. Дамарацкага; «Старагародская сюіта» В. Малых і іншыя. Трэба адзначыць і дзейнасць Нацыянальнага акадэмічнага народнага хора Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара М. Дрынеўскага. У складзе інструментальнай групы гэтага калектыва вылучаюцца такія беларускія духавыя інструменты, як дудка, жалейка, дуда, акарына, драўляныя трубы. Выканаўцам на гэтых інструментах з'яўляецца выпускнік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Дз. Буры. Неабходна адзначыць, што аркестровыя групы ансамбляў «Харошкі» (выпускнік БДУКМ А. Каляда), «Свята», «Бяседа», дзяржаўнага ансамбля танца Рэспублікі Беларусь таксама выкарыстоўваюць у сваім рэпертуары народныя духавыя інструменты.

Сусветнавядомы вакальна-інструментальны ансамбль «Песняры», створаны У. Мулявіным у 1969 годзе, папулярызаваў не толькі беларускія песні, але і традыцыйны інструментарый беларусаў (разнастайныя дудкі, жалейка, акарына, дуда). У цяперашнім складзе калектыва – студэнт БДУКМ А. Жых. На пачатку 1990-х гадоў і пазней на канцэртных пляцоўках сталі з'яўляцца рок-гурты, дзе музыкі гралі на розных беларускіх народных духавых інструментах (на дудцы, дудзе, жалейцы). У «Палацы» (створаны ў 1992 г. выпускніком БДУКМ А. Хаменкам) выкарыстоўваюць традыцыйныя аўтэнтычныя беларускія інструменты – дуду, дудку, жалейку, сурму пры аранжыроўках песень «Дзеўка сямілетка», «А ў заенкі», «Ляцеў воран», «На турэцкіх палях»). Гучаць дуды і жалейкі і ў рок-гуртах «Юр'я», «Нэйра Дзюбель», «Зніч».

У сярэдзіне 1990-х і на пачатку 2000-х гг. з'явіліся так званыя «пост-фальклорныя» гурты (складзеныя з гарадскіх выканаўцаў вясковага фальклору) і medieval-гурты (складзеныя з рэканструктараў гістарычнай еўрапейскай музыкі) – калектывы, базавым інструментам якіх з'яўлялася дуда: «Ліцьвіны», «Ветах», «Стары Ольса», «Келіх кола», «Тэстамент», «Літвінтроль», «Кудзьмень», «Ліцьвінскі хмель». Піянеры пост-фальклору Беларусі –

«Ліцьвіны» (кіраўнік Ул. Бярбераў – збіральнік фальклору, дудар, заснавальнік збору народных інструментаў Заслаўскага музея) – з 1992 г. першымі ўвялі дуду ў большасць сваіх інструментальных партытур, паралельна ў акампанеменце спевам гучалі цымбалы, скрыпка, гармонік. Калектыў мае буйную дыскаграфію, дзе прадстаўлены фальклорныя творы з розных рэгіёнаў Беларусі (Ліцьвіны. Голуб на чарэшні, галубка на вішні. – CD, 1992; Ліцьвіны. Неба і зямля. – CD, 1994; Ліцьвіны. 5 сакавіка: Канцэрт 5.03.1996 у тэатры Вольная сцэна. – CD, 1996; Ліцьвіны. А ў лузе-лузе. – CD, 1999). Калектыў, канцэптуальна «абапіраючыся» ў інструментарыі выключна на тандэм скрыпкі і дуды, стварыў у 1998 годзе этнасеміётык, выканаўца на скрыпкцы, гуслях, дудзе Вячаслаў Калацэй. «Ветах» першым пачаў ладзіць дударскія этнадыскатэкі (серыя імпрэз 2001-2008 гг. «Па Крывіі без баяна») у мінскіх клубах, праводзіць «пад дуду» купальскае, траецкае, загукальна-веснавое, каляднае святы з шырокім далучэннем моладзі да знаёмства з каранёвай музыкай Беларусі, рэканструяваць партытуры для дуды і скрыпкі паводле побытавых танцаў беларусаў («Кракавяк», «Гапак», «Лявоніха», «Ойра», «Картузэ»). Аснова яго рэпертуару – фальклор паўночнай і цэнтральнай Беларусі, пост-фальклорная перапрацоўка якога прадстаўлена ў дыскаграфіі гурта (Ветах&Верас. Тэмпаральнасць – CD, 1998; Талака&Ветах. Страла. – CD, 2003; Live Vietah on DVD – DVD, 2006; Vietah in an acid childhood – CD, 2008) [14]. «Стары Ольса» (стваральнік і кіраўнік – Зміцер Сасноўскі, адна з удзельнікаў – студэнтка БДУКМ М. Шарый) – гурт сярэднявечнай беларускай музыкі, існуе з 1999 г. У рэпертуары – беларускія народныя балады і ваярскія песні, творы беларускіх кампазітараў эпохі Рэнесанса, кампазіцыі з беларускіх зборнікаў прыдворнай музыкі («Полацкі сшытак», «Віленскі сшытак»), беларускія канты XVI – пачатку XVII стагоддзяў, а таксама еўрапейскія папулярныя мелодыі эпохі Сярэднявечча і Рэнесанса. Народныя духавыя інструменты выкарыстоўваюцца амаль ва ўсіх творах: «Слова пахвальнае Георгію»; «Падымаліс чорны хмары...»; «Песнь о велебной девици панне Марии»; «Грунвальдская бітва 1410 г.»; «Пахвала Вітаўту»; «Клецкая бітва»; «Пахвала гетману Астрожскаму»; «Аршанская бітва» і інш.).

Увагі заслугоўвае і этна-трыа «Троіца» (мастацкі кіраўнік І. Кірчук). Гэты калектыў мае своеасаблівы стыль, які абапіраецца на ўзоры аўтэнтычнага фальклору, веды па традыцыйнай культуры выканання на народных духавых інструментах, але абапіраецца хутчэй на world music. Характэрны ў гэтым кантэксце яго творы: «Ой, ты, кучар малады», «Рождество Христово».

З аматарскіх калектываў стабільнасцю і майстэрствам выдзяляецца ансамбль «Крупіцкія музыкі», які доўгі час узначальваў заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь У. Гром. Дзякуючы кіраўніку гэтага калектыва атрымалі новае жыццё шмат беларускіх інструментаў. У рэпертуары ансамбля пэўная колькасць твораў для беларускіх духавых інструментаў (як апрацовак народных песень і танцаў, так і аўтарскіх): «Заездзіў коніка», «Кола беларускіх танцаў», «Шастак», «На Купалле», «Гэй, у Слуцку-горадзе», «Ой, музыкі мае», «Слуцкая полька», «Чэрнічскія найгрышы» і іншыя. За «Крупіцкімі музыкамі» шмат аматарскіх фальклорных калектываў пачалі выкарыстоўваць народныя духавыя ў сваёй практыцы. Сярод іх ансамбль народнай песні «Хаціславанне» (кіраўнік А. Хоміч), Хваставіцкі народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Спадчына» (кіраўнік Р. Сокал), ансамбль «Чарняначкі» (кіраўнік В. Дзегель), фальклорны гурт БДУ «Тутэйшая шляхта» (кіраўнік Л. Махнач, творы для беларускіх духавых: «Каравай», «Гэй, паехаў сын Даніла», «Як пайшла я па лугу» і г.д.), народны калектыў СДК в. Пятрышкі «Спатканне» (кіраўнік С.Кудзін), «Хажоўскія музыкі» і шмат іншых.

З вучэбных калектываў асаблівае месца займае Мінскі ўзорны дзіцячы фальклорны ансамбль «Дударыкі», створаны ў 1970 годзе Дзмітрыем Ровенскім, дзе шырока выкарыстоўваюцца дудкі і жалейкі. Адметнасць «Дударыкаў» у тым, што засваенне, навучанне на інструментах (у тым ліку і духавых) адбываецца пры дапамозе гульні па паказу, назіранні, імправізацыі, як у традыцыі, без нот. Інакш кажучы, выкарыстоўваецца адзін з метадаў этнапедагогікі.

Унікальным калектывам з'яўляецца капэла беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды», якая была створана ў 1999 годзе на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры (зараз БДУКМ) дацэнтам У. Громам. Капэла не мае аналагаў не толькі ў Беларусі, але і ў краінах СНД. У калектыве гучаць народныя духавыя інструменты, якія бытавалі на тэрыторыі Беларусі з даўніх часоў: акарыны, свістулькі, дудкі, жалейкі, саломкі, чароткі, дуды, рагі, драўляныя трубы. Ансамбль выконвае старадаўнюю беларускую музыку, творы і апрацоўкі сучасных беларускіх аўтараў, спрабуе спалучаць традыцыйныя інструменты з электроннымі [8, с. 4]. Сёння ўдзельнікамі калектыву з'яўляюцца студэнты аддзялення духавыя інструменты (народныя), пры гэтым, амаль кожны з іх за час навучання ва універсітэце авалодвае навыкамі ігры на некалькіх духавых інструментах (пераважна дудка, жалейка, акарына, дуда). Рэпертуар калектыва складаецца ў асноўным з аўтарскіх твораў і апрацовак беларускіх народных песень і танцаў І. Мангушава, А. Крамко, У. Грома: «Сваты едуць», «Скакуха», «На Грунвальд», «Ой, ляцелі гусі», «Мірскі замак», «Кола беларускіх танцаў», «Баль у маёнтку Агінты», «Казка», «Полька з крэсаў», «Рэчанька», «Ранішні харал», «Святочны паланэз», «Чароўнае імгненне» і іншыя.

Такім чынам, цікавасць да народных духавых з'явілася дзякуючы намаганням невялікай групы людзей з творчага асяроддзя. Іх сумеснымі намаганнямі быў адноўлены шэраг беларускіх народных

духавых інструментаў, пачалося станаўленне новай выканальніцкай школы, паколькі старая была страчана ў сярэдзіне XX ст. Сёння праблема стабільнага забеспячэння інструментамі, на жаль, не вырашана, як і не пабудавана «па вертыкалі» сістэма навучання на гэтых інструментах (пачынаючы са школы і заканчываючы ВНУ). Апошняе адмоўна сказваецца на станаўленні выканальніцкай школы на беларускіх народных духавых інструментах, на прафесійным узроўні выканаўцаў. Назіраюцца праблемы і з рэпертуарам. Пры гэтым роля тых жа дудкі, жалейкі, дуды і акарыны ў сучаснай народна-інструментальнай практыцы звычайна зводзіцца толькі да надання пэўнага каларыту, мастацкай прыгажосці. Пераважная большасць кіраўнікоў ансамбляў не разглядае гэтыя інструменты як самастойныя з прычыны няведання іх тэхнічных і мастацкіх магчымасцяў. У сваю чаргу, практыка паказвае, што тэмбр беларускіх духавых інструментаў уплывае на характар выкананага твора, на перадачу зместу той ці іншай песні, дапамагае падчас спеваў. Галасы народных інструментаў служаць сродкам, які можа суцешыць чалавека, выклікаць добрыя пачуцці, дапамагчы ў паўсядзённым жыцці.

Спіс літаратуры:


1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя. У 2 т. Т.1. А-К / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск : Бел. энцыкл., 2005. – 768 с.
2. Беларускі фальклор : энцыклапедыя. У 2 т. Т.2. Л-Я / гал. рэд. Г.П. Пашкоў. – Мінск : Бел. энцыкл., 2006. – 832 с.
3. Гром, У. М. Заіграйце, музыкі! : Рэперт. зб. для фальклор. калектываў : у 2 ч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч.1. – 111 с.
4. Гром, У.М. Заіграйце, музыкі! : Рэперт. зб. для фальклор. калектываў : у 2 ч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч.2. – 155 с.
5. Гром, У.М. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мінск : Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.
6. Гром, У.М. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мінск : Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.
7. Карацееў, А.Л. Неардынарная з'ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А.Л. Карацееў // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 119–122.
8. Крамко, А.Я. Беларускія народныя духавыя інструменты: вучэбны дапаможнік / А.Я. Крамко. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.
9. Назіна, І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І.Д. Назіна – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.
10. Ярук, С.П. Белорусская дудка в национальной музыкальной культуре (на примере изучения и освоения художественно-исполнительских возможностей народного инструмента) / С.П. Ярук // Научные исследования и их практическое применение. Современное состояние и пути развития : сб. науч. тр. по материалам междунар. научн.-практ. конф. – Одесса : Черноморье, 2007. – История, геология, государственное управление, искусствоведение и архитектура, туризм и рекреация, физическое воспитание и спорт. – С.66 – 71.
11. Гурт «Стары Ольса» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.staryolsa.com. – Дата доступа : 21. 02. 2008.
12. Гурт «Палац» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http:// www.palac.org. – Дата доступа : 25. 03. 2008.
13. Гурт «Троіца» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http:// www.troitsa.net. – Дата доступа : 16. 04. 2008.
14. Гурт «Ветах» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http:// www.vietah.narod.ru. – Дата доступа : 21. 04. 2008.


***Святлана Кананові̌ч***

## ЭТНАКУЛЬТУРНАЕ ВЫХАВАННЕ Ў МУЗЕІ ЯК АДЗІН З СРОДКАЎ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Пытанні захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны набываюць асаблівае значэнне ў сувязі з абвастрэннем сацыяльна-культурных праблем (праблем адукацыі, маралі і выхавання), якія ў стане вырашыць менавіта спадчынная, аксіялагічная, найбольш каштоўная частка традыцыйнай культуры. Яна захавала і зберагла ў сабе найбагацейшы выхаваўчы вопыт, які назапасіўся за ўвесь час існавання беларускага этнасу. Апошняе паслядоўна і рознабакова выкладзена ў працах даследчыкаў Л. Гумілёва, С. Болбаса, В. Калацэя,
Н. Матыліцкай, М. Козенкі і інш.

Дзейнасць, што спрыяе трансляцыі фальклорнай традыцыі ў грамадстве, мае прававую падтрымку на дзяржаўным і міжнародным узроўнях: «Рэкамендацыі пра захаванне фальклору» UNESCO (рэзалюцыя прынята на 32-м пасяджэнні 15 лістапада 1989 г.); «Праграма дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры» Рэспублікі Беларусь на 1994–1996 гады, рэалізацыя пэўных палажэнняў якой працягваецца; дзяржаўныя навукова-тэхнічныя праграмы «Культура» (1997), галіновая навукова-тэхнічная праграма «Захаванне і развіццё культуры ў Рэспубліцы Беларусь да 2010 г.»; пэўныя раздзелы закона «Аб